

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№22 (364) Серада, 26 траўня 2004 года gs.promedia.by

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ

Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by



ПОСЛЕДНИЙ ДЕНЬ ДЕТСТВА

Фота Таццяны ПЛАХЕЦКАЙ

Во вторник выпускники 11-х классов средней школы №8 г.Слонима провели расставание с детством – день малыша. Девочки и мальчики в детских костюмчиках прошлись по городу, побывали в парке, а также заглянули в редакцию нашей газеты. Да, сегодня для них был последний день детства, а завтра ребят ждут выпускные экзамены и дорога в самостоятельную жизнь. Пусть вам, дорогие наши выпускники, сопутствуют успех и везение. Ни пуха ни пера!

ГАНДАЛЬ

ЯКАСЦІ НЕ ГАРАНТУЮЦЬ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

Надпіс на доўгай папяровай стужцы ці на кавалку кардону "Без гарантыі якасці" — ужо даўно не навіна для нашага гандлю. Такія надпісы аздабляюць у крамах паліцы з таварам пад шыльдай "Канфіскат".

Калі прадаюць без гарантыі канфіскаваную гарэлку, гэта выклікае насцярожанасць. А калі, як у краме "Спутник", на паліцы з канфіскаванымі прэзерватывамі чытаеш "без гарантыі якасці" — здзіўляешся арыгінальнасці такога папярэджання.

Канфіскавалі мытнікі ці іншыя кантралёры ў якогась незадачлівага камерсанта цыгарэты, каву, гарбату, адэкалон і да т.п., значыць, гэты тавар у хуткім часе павінен з'явіцца ў розлічным гандлі пад адпаведнай шыльдай і па крыху ніжэйшым кошце, чым звычайна.

У Слоніме канфіскатам гандлююць у "Спутнике", "Дружбе", у крамах райспажыўсаюза, мясакамбіната, фірмы "Світанак", станцыі тэхабслугоўвання і фабрыкі мастацкіх вырабаў. Такі гандаль ідзе на цалкам законнай падставе.

Як патлумачыла галоўны спецыяліст аддзела эканамічнага рэгулявання райвыканкама Вольга Саўчыц, канфіскаваныя тавары паступаюць на паліцы крамаў пасля рашэння суда. Але перад тым яны праходзяць адпаведную ацэначную камісію. Ёсць групы тавараў, якія праходзяць таксама абавязковую сертыфікацыю і экспертызу якасці перад паступленнем у продаж. Калі ж выявіцца, што канфіскаваны тавар сумнiўнай якасці, то яго павінны альбо адправіць на перапрацоўку (як, напрыклад, няякасную гарэлку), альбо проста знішчыць (харчовыя тавары з пратэрмінаванай датай спажывання).

Тавары, якія трапілі на крамную паліцу такім чынам, не павінны пагражаць здароўю пакупнікоў. І ўсё ж гарантыі іх якасці гандлёвыя прадпрыемствы не даюць. На ўсялякі выпадак. Пакупнік застаецца вольны ў сваім выбары: купіць крыху танней і без гарантыі ці з гарантыяй, але даражэй.

Сэнс жа гарантыі якасці зводзіцца да таго, што гарантыйны тавар вы можаце абмяняць ці вярнуць за яго свае грошы, калі раптам выявіцца, што ён няякасны. А вось набыты ў той жа краме канфіскат вяртанню і абмену не падлягае. Вас жа папярэджваюць — "без гарантыі якасці". Так сказаць, свабода выбару. Такія папярэджанні могуць насцярожваць ці нават здзіўляць.

Аднак самае галоўнае для нас сёння — кошт тавару. Большая частка пакупнікоў упэўнена: калі нейкія рэчы ці прадукты прадаюцца ў краме, значыць, яны прыгодныя для ўжывання. За танейшым канфіскатам, бывае, нават вялікія чэргі ўтвараюцца.



■ У краме "Дружба" на Энцы можна набыць канфіскаваную мэблю

А здараецца, што ўцэнены нехадавы тавар купляюць і ўжываюць не зусім па прамым прызначэнні. Так, напрыклад, на мінулым тыдні ў краме фабрыкі мастацкіх вырабаў попытам карыстаўся адэкалон "Цытрусавы" па 200 рублёў за флакон. Як кажуць, танна і сярдзіта. Куплялі яго асобы, якія звычайна зранку кучкуюцца каля вінна-гарэлачных аддзелаў. Набыўшы па некалькі флаконаў, яны здымалі з адэкалону пробу на якасць на Ружанскіх могілках. Сімвалічнае, трэба прызнаць, месца для ўжывання такога спіртнога напою. Але галоўнае, што кожны з нас мае права выбару быць самому сабе гарантам бяспекі. ■

ЗДАРЭННІ

ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ — ДАЛЕЙ БУДЗЕШ



■ Прыехалі...

Вынікам аварыі, якая адбылася вечарам 25 траўня на перакрыжаванні вуліц Карла Маркса і 17 Верасня ў Слоніме, стаў перакулены легкавік "пежо".

Адна з машын, парушаючы правілы руху, выехала на галоўную дарогу і стварыла аварыйную сітуацыю. А легкавік "пежо", каб пазбегнуць сутыкнення, змяніў кірунак руху і перакуліўся.

Падчас гэтай аварыі пацярпела дзяўчына, якая ішла па тратуары. З траўмаю яе даставілі ў бальніцу.

На некалькі дзён раней дарожна-транспартнае здарэнне было зафіксавана на Чырвонаармейскай вуліцы. Аўтамашына, у якой ехалі семінарысты Мінскай духоўнай семінарыі з Жыровічаў у цэнтр горада, наехала на прыпаркаваны легкавік. У выніку ўдару атрымаў пашкоджанні пляча адзін з семінарыстаў, ён быў шпіталізаваны.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЭКОНОМИКА

ЧТО ЗАРАБОТАЛ, ТО И ПОЛУЧИ

Отдел статистики Слонимского райисполкома обнародовал данные о заработной плате работающих на предприятиях, в организациях, в сельском хозяйстве района.

Средняя заработная плата работающих в январе–апреле 2004 года составила 239,2 тысячи рублей, в том числе в апреле — 258,9 тысячи рублей. Она увеличилась по сравнению с соответствующим периодом прошлого года в 1,3 раза.

Наибольшая средняя заработная плата была начислена работникам финансовых, кредитных и страховых структур — 500,2 тысячи рублей, за ними следуют управленцы — 412,1 тысячи рублей среднемесячного дохода.

Работники промышленности в среднем за четыре месяца текущего года получили 243,8 тысячи рублей ежемесячно, строители — 277,8 тысячи рублей, работники торговли и общественного питания — 189,3 тысячи рублей, работники учреждений здравоохранения — 230,9 тысячи рублей. Еще раз следует отметить, речь идет о средней зарплате для всех работающих в отрасли, начиная



■ Денег всегда не хватает

от простого служащего (рабочего) и заканчивая руководителями высшего звена. Вот почему те слонимчане, к которым корреспондент "ГС" обращалась на улицах города, только удивленно поднимали брови, когда слышали суммы, которые они якобы получают.

В общем, подсчеты велись, как всегда, по принципу из притчи о курице: один съел целую курицу, другой — только косточки обглодал, а посчитали, что двое ели на равных. А значит, сытыми и довольными должны быть оба.

Янина МЕЛЬНИКОВА

●●● ИНФОРМАЦИЯ ●●●

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
25.05.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	6 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1000 - 1 500 руб.
Картофель	1 000 - 2 000 руб. за ведро
Капуста свежая	3 000 руб.
Морковь	400 - 500 руб.
Лук	600 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	2 900 - 3 500 руб.
Огурцы	2 200 - 3 500 руб.
Яблоки	1 700 - 3 100 руб.
Апельсины	2 100 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 400 руб.
Лимоны	2 800 - 3 300 руб.
Киви	550 руб. шт.
Гранаты	5 000 руб.
Бананы	2 000 - 2 200 руб.
Свинина	4 500 - 8 800 руб.
Говядина	500 — 8 800 руб.
Телятина	—
Сало свежее	2 600 - 3 900 руб.
солёное	3 900 - 4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 200 - 1 400 руб.
Гречка	1 200 - 1 700 руб.
Рис	1 250 - 1 500 руб.
Мука (2 кг)	2 100 - 2 200 руб.
Сахар	не продаётся
Подсолнечное масло, (1 л)	1 900 - 2 600 руб.
Мёд	12 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
25.05.2004 г.

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2175
1 EURO	2520	2620
1 ZL	450	555
1 RUR	72,5	75
"Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2170
1 EURO	2520	2610
1 ZL	520	555
1 RUR	73,5	79
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2175
1 EURO	2500	2610
1 ZL	450	570
1 LAT	3800	4050
1 LIT	600	780
1 UAH	370	420
1 GBP	3700	3900
1 RUR	69	75
Нацбанк РБ		
1 USD	2153	
1 EURO	2575,26	
1 RUR	74,26	

НОВОСТЬ

СЛОНИМЧАНЕ ВЫШЛИ В ФИНАЛ

В Слониме состоялись зональные соревнования чемпионата области по мини-футболу среди работников МЧС.

Наш город навестили пожарный аварийно-спасательный отряд (ПАСО) Гродненской области, городской отдел по чрезвычайным ситуациям (ГОЧС) из Гродно, ПАСО-5 (ОАО «Азот»), а также спасатели из Волковысского и Лидского районов.

Вначале команды сыграли в группах, первые места в которых заняли наши земляки и футболисты из ПАСО. Несмотря на то, что хозяева соревнований уступили 0:3, они все равно вышли в финал. В матче за третье место лидчане разгромили команду Волковысского РОЧС.

Александр ЗАХАРЕНКО

СОЦИУМ

В ЗОНЕ ОТЧУЖДЕНИЯ

"...государство на нас давно махнуло рукой, льгот почти не осталось, а те, что есть, все равно требовать не у кого..."

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

О Чернобыле и чернобыльцах пишут воспоминания, романы и документальные повести. Со своими проблемами они обращаются к политикам, правозащитникам, журналистам.

Только проблем этих меньше не становится. Наоборот, с каждым годом количество льготников-ликвидаторов аварии на ЧАЭС становится все меньше, и льготы оставшимся жить тоже урезают. Ничего удивительного: страна у нас небогатая, всем бесплатный проезд и санаторно-курортное лечение обеспечить не может, вот и приходится отказывать даже тем, кто в них отчаянно нуждается. Время такое.

Николай Николаевич Окулевич со своей участью давно смирился. Ну и что, что ликвидатор? Ну и что, что на работу брать уже 10 лет не хотят? Ведь жив, относительно здоров (инвалидность врачи не ставят, даже несмотря на диагноз "аллергия на все виды лекарств"). Потому он был приятно удивлен, когда прочитал в №20 "Газеты Слонімскай" статью О. Шинкевич "Какой же я халявщик?":

— Я как-то ехал в автобусе без билета (ведь у меня удостоверение ликвидатора), так мне штраф выписали, в суд дело передали. А после вашей статьи никто денег не требовал! Спасибо, я уже и не надеялся, что что-то изменится. Ведь государство на нас давно махнуло рукой, льгот почти не осталось, а те, что есть, все равно требовать не у кого...

К примеру, выписали Николаю Николаевичу рецепт на бесплатное получение дорогостоящего лекарства. И вот уже который месяц подряд ходит, обивает пороги аптеки. Говорят, льготного лекарства нет, а вот за его деньги купить можно. Только откуда взять эти самые деньги, когда живет Николай Окулевич вместе с женой на ее пенсию? Потому что свою по возрасту еще не заслужил, а для того, чтобы оформить льготную пенсию ликвидатора, необходимо быть человеком недюжинной силы воли и железных нервов.

Ведь, как оказалось, мало быть просто ликвидатором последствий аварии на ЧАЭС, надо еще иметь удостоверение инвалида. А если (слава Богу) явной инвалидности у тебя нет, значит, ее тебе никто ставить не станет. Можно, конечно, попытаться доказать, что ты работал в 10-километровой зоне отчуждения, но вот Центральный архив Министерства обороны Республики Беларусь на запрос дает однозначный ответ: "В приказах войсковой части №... не отражены населенные пункты, где проводились работы".

Излишняя военная секретность советской армии лишила Николая Николаевича и его сослуживцев и этой возможности что-то кому-то доказать.

Да он уже и не стремится: скоро подойдет возраст, и он получит свою самую обычную пенсию. Пусть так, но душа Николая Николаевича болит за других, за тех, чей пенсионный возраст только на подходе. Ведь в 1987 году в Чернобыле ему уже было немало лет, а его друзья, призванные на "учебно-специальные сборы" в зону, были куда младше. Что они станут делать через пару–тройку лет? Какие пороги станут обивать? Кого просить вспомнить о них? А чиновники в ответ только усмехаются: "Мы вас туда не посылали... И вообще Чернобыль теперь — это территория Украины".

Вот так, вчерашняя беда забыта, отчужденные земли потихоньку заселяются людьми. На них выращивают хлеб, овощи, фрукты. Президент который год к ряду на личном примере показывает, что, кроме внешних врагов в лице НАТО, нам в общемто и бояться нечего, а уж радиации (которую не пощупаешь и не понюхаешь) тем более. ■

"01" СООБЩАЕТ

ДЕВЯТЬ ПОЖАРОВ ЗА ТРИ НЕДЕЛИ

За три недели мая в Слониме и Слонимском районе произошло 9 пожаров, на которых погибли 2 человека.

Огнем уничтожено полностью 2 строения, 4 головы скота. Повреждено 6 строений и 2 единицы техники.

Так, например, 20 мая произошел пожар в пер. Приречном – загорелся жилой дом. В результате огнем уничтожены крыша и внутренние перегородки дома. Причина пожара и материальный ущерб устанавливаются.

А 22 мая в результате неосторожного обращения с огнем при сжигании костра гражданкой Т. загорелись две постройки по ул. Кирпичной. Материальный ущерб устанавливается.

23 мая в пер. Шоссейном загорелся автомобиль "Опель-Аскона". В результате огнем уничтожен салон автомобиля, поврежден кузов.

А с начала года на территории Слонимского района произошло 33 пожара, материальный ущерб от которых составил более 81 миллиона рублей.

За этот же период 2004 года в Гродненской области произошел 521 пожар (материальный ущерб составил более 484 миллионов рублей). В огне погибли 63 человека, 3 из которых – дети. Еще 16 человек получили серьезные ожоги. Полностью уничтожено 123 строения, 129 тонн грубых кормов.

Сергей НОВИЦКИЙ, госинспектор по пожарному надзору

ЗДАРЭННІ

КІНУЎ НЕДАПАЛАК

У ноч з 20 на 21 траўня ў шматпавярховіку на вуліцы Тапалёвай загарэліся ўваходныя дзверы адной з кватэр.

Хутка было ўстаноўлена, што яны загарэліся ад недапалка цыгарэты, які неасцярожна кінуў на палавік перад дзвярамі жыхар суседняга дома.

ЗНЯЛІ МАГНІТОЛЫ І НУМАРЫ

На мінулым тыдні на вуліцы Яршова і новай Брэсцкай з двух аўтамабіляў, што засталіся стаяць без нагляду, зніклі аўтамагнітолы.

А ў мікрараёне Энка каля пад'езда аднаго з дамоў з іншамаркі знялі дзяржнумары.

Па фактах крадзяжоў праводзяцца праверкі.

ДЗЕ ДАЛЯРЫ?

Каля 200 даляраў ЗША зніклі на працы ў жанчыны-кухара дзіцячага сада №16.

Цяпер работнікі міліцыі высвятляюць, куды падзеліся грошы.

ПАСКАНДАЛІЛІ ДЗЯЎЧАТЫ

Дзве 18-гадовыя сланімчанкі вызначыліся на дыскатэцы "Оскар" у мінулыя выхадныя.

За скандал і мацюкі ў грамадскім месцы іх затрымалі работнікі міліцыі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРАБЛЕМА

ЗА ГОД ЗВАЛКА РАЗРАСЛАСЯ ДА ДАРОГІ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

Каля вёскі Шылавічы, прыкладна за 500 метраў ад могілак па дарозе на вайсковы палігон, знаходзіцца звалка бытавых адходаў Велікашылавіцкага сельсавета. Звалку там зрабілі летась, калі добраўпарадкавалі навакольныя вёскі. З той пары гэты сметнік застаўся фактычна без нагляду.


— За год завалілі нават дарогу, а цяпер ужо і на людскія пасевы выгружаюць смецце, — скардзіўся жыхар Шылавіч Аляксей Пятрашка. — Возяць і свае вяскоўцы, і з былога саўгаса, і нават з горада. Выкідаюць смецце абы-дзе, часам не даязджаючы да звалкі, і ніхто за гэта не адказвае...

Праблема, якую закрануў Аляксей Пятрашка, актуальная не толькі для Шылавіч. У мінулым годзе, калі праводзілася агульнарэспубліканская акцыя навядзення парадку на зямлі, практычна ў кожным сельсавеце стварылі звалкі бытавых адходаў. Туды пазвозілі смецце, якое гадамі назапашвалася на многіх вясковых сметніках, і працягваюць вазіць цяпер. Звалкі гэтыя законныя, і адказнасць за парадак на іх павінен несці выканкам сельскага Савета, на тэрыторыі якога яны знаходзяцца. Аднак сельскія выканкамы не маюць ні сродкаў, ні спецыяльнай тэхнікі, каб падтрымліваць парадак на гэтых міні-палігонах бытавых адходаў. Атрымліваецца, што сельскія звалкі засталіся без гаспадара і "ніхто за гэта не адказвае".



■ Так сёння выглядае звалка каля Шылавіч

Аднак і вясковым, і раённым уладам праблема гэтая добра вядомая. Як патлумачылі карэспандэнту "ГС" у Велікашылавіцкім сельскім выканкаме, цяпер рыхтуецца дакументацыя аб перадачы міні-палігонаў бытавых адходаў на баланс РУП ЖКГ. У раённых камунальшчыкаў магчымасці для навядзення парадку на звалках ужо, напэўна, будуць. Застаецца толькі пачакаць. ■


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Анастасія Бурачэўская з прызам

ІНТЭРВ'Ю З НАГОДЫ

Анастасія БУРАЧЭЎСКАЯ: "КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ Ў ВАРШАВЕ ПРАХОДЗІЎ ВЕЛЬМІ ШЧЫРА"

■ Сяргей ЧЫГРЫН

Як мы ўжо паведамлялі, юная слонімская прыгажуня Анастасія Бурачэўская па выніках рэспубліканскага кастынгу Нацыянальнай школы прыгажосці стала пераможцай і ўзяла ўдзел у Міжнародным конкурсе прыгажосці ў Варшаве, дзе заняла другое месца.

Насця вучыцца ў СШ №8 горада Слоніма і наведвае школу мадэлей "ЛеОна", якая дзейнічае пры ўстанове пазашкольнага выхавання і навучання "Скарбніца" аддзела адукацыі Слонімскага райвыканкама. Сёння яна адказвае на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Насця, віншуем цябе з першаю сур'ёзнаю перамогаю і зычым новых удач. А як наогул успрынялі ў школе тваю перамогу?

— Вельмі добра. Усе віншавалі, пыталіся, як праходзіў конкурс. А настаўніца музыкі наогул радавалася за мяне больш, чым я. Мой класны кіраўнік Алена Мікалаеўна Ракевіч таксама павіншавала і сказала: "Так трымацць!"

— А бацькі?

— Мама з татам , як і я, яшчэ ў гэты поспех не вераць. Мусіць, ім здаецца, што ўсё гэта пакуль дзіцячая гульня.

— Хто праводзіў гэты конкурс і фінансаваў тваю паездку ў Варшаву?

— Спонсарам конкурсу было англійскае мадэльнае агенцтва "Лук модэл менеджмент". Яно ўсе мае затраты і аплачвала.

— Што табе, Насця, спадабалася і запомнілася падчас конкурсу?

— Найперш гэта зносіны паміж канкурсанткамі і знаёмствы. Гутарылі мы толькі на англійскай мове, а ўдзельнічала ў конкурсе 41 дзяўчынка з 20 краін. Мне спадабалася там усё, таму што адчувалася, што конкурс праходзіў вельмі тактоўна, шчыра. А пераможцай стала дзяўчына з Македоніі.

— З кім ты найлепш пасябравала?

— У адным пакоі я жыла з дзяўчынкаю са Швецыі. Практычна за ўвесь час мы ўсе і пераназёміліся. А каб блізка пасябраваць, проста нам не хапіла часу.

— Акрамя мамы з татам, хто яшчэ за цябе перажываў?

— Сябра яшчэ няма. Хаця, як і ўсе дзяўчаты майго ўзросту, люблю наведваць дыскатэку, асабліва люблю школьныя танцы, падабаецца жартаваць, весяліцца. У нас вельмі дружны клас. Але з 21-го вучня ў нашым 8 "А" класе толькі трое хлопчыкаў. І мне здаецца, што хлопчыкі ў нас у класе менш сталыя, чым дзяўчынкі.

— Якое тваё хобі?

— У Варшаве нам без падрыхтоўкі прапанавалі правесці "Вечар талентаў". Часу на падрыхтоўку не было. І я вырашыла сыграць на раялі. Для мяне спецыяльна прывезлі гэты музычны інструмент, і я выдатна сыграла. Усім вельмі спадабалася. Музыка і з'яўляецца маім захапленнем, бо я ўжо сем гадоў з ёю не развітваюся.

— Як праходзіў сам конкурс?

— Спачатку выбіраліся 14 прыгажунь, а пасля з іх толькі тры. І пераважна іх выбіралі на рэпетыцыях, а падчас конкурсу было толькі пацвярджэнне.

— А што вы журы паказвалі?

— Сябе. Спачатку ў касцюмах, пасля ў купальніках, потым у майках і спадніцах і г.д. І мне дасталося другое месца і прыгожы крышталевы прыз.

— І да якога наступнага конкурсу ты рыхтуешся?

— Пакуль яшчэ не ведаю. Але прапановы, спадзяюся, будуць.

— Няхай табе спадарожнічае поспех! ■

СПАДЧЫНА

СЁННЯ Ў НАШАЙ ХАЦЕ СВЯТА


Фота Аляксандра ЗАХАРАНКІ

■ Навучэнкі ГПТВ–129 запрашаюць гасцей на сваё свята

Апынуцца на сапраўдных вячорках давялося нядаўна карэспандэнту "ГС".

Гэту імпрэзу арганізавалі сумеснымі намаганнямі гуртокўцы Слонімскага раённага цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і ўстановы пазашкольнага выхавання і адукацыі "Скарбніца".

Удзельнікі гуртка "Літаратурнае краязнаўства"(кіраўнік — А. Хомка) і "Урокі майстэрства"(кіраўнік — В. Ярмаловіч) прадэманстравалі прысутным сваё веды, тэатральныя здольнасці, уменне па-майстэрску спяваць і танцаваць.

Гледачы ўбачылі і сам абрад "Вячоркі", даведаліся пра іншыя народныя святы і абрады. Спадабаліся ім таксама і вырабы, змайстраваныя гуртокўцамі.


Вельмі прыемна, што дзяўчат (а ўсе яны навучэнкі ГПТВ–129) прываблівае нацыянальная спадчына і яны не толькі самі вывучаюць сваю гісторыю, але і імкнуцца данесці яе набыткі іншым.

Мікалай РАДЗІВОНАЎ

ШКОЛА

"ТРЫБУНАЛ" У ВОСЬМАЙ ШКОЛЕ

Некалькі гадоў у СШ №8 г. Слоніма дзейнічае творчая група "Спадчына", якой кіруе настаўніца роднай мовы і літаратуры Алена Герасімчык.


Фота Яніны МЕЛЬНІКАВАЙ

■ Сцэна са спектакля "Трыбунал"

Сябры творчай групы праводзяць розныя святы, вечары, ставяць спектаклі. Днямі на школьнай сцэне адбылася прэм'ера спектакля "Трыбунал" паводле п'есы Андрэя Макаёнка. Свой творчы падарунак юныя артысты прысвяцілі 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

ІДЗЕ ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ КВАТЭР ВЕТЭРАНАЎ І ІНВАЛІДАЎ ВАЙНЫ

КАМУНАЛКА. Да 1 лістапада 2004 года кампанія "Белтэлекам" абяцае задаволіць па Гродзенскай вобласці 401 заяўку на ўстаноўку тэлефонаў ветэранам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, якім больш за 70 гадоў і якія сталі на ўлік да 1 ліпеня 2003 года.

Такім жа па ўзросце ветэранам і інвалідам вайны, якія падалі заяўку пасля 1 ліпеня 2003 года, тэлефоны ўстановяць на працягу 2004–2005 гадоў. Па стане на 1 траўня 2004 года ў Слонімскім раёне названай катэгорыі ветэранаў і інвалідаў ВАВ было ўстаноўлена 32 тэлефоны, у Дзятлаўскім раёне — 11, у Зэльвенскім — 5 і ў Мастоўскім — 9 тэлефонаў. Тэлефанізацыя ветэранаў і інвалідаў вайны ніяк не падзейнічае на планавыя работы па тэлефанізацыі насельніцтва вобласці, у тым ліку і льготнай катэгорыі грамадзян, абяцае "Белтэлекам". На пачатак траўня ў Гродзенскай вобласці сярэдняя тэлефонная шчыльнасць на 100 чалавек складала 31,1 і 79,1 — на 100 сем'яў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ДЕТИ ИГРАЮТ В ВОЙНУ

ШКОЛА. В День пионерии, 19 мая, в военном городке «Звездный» на базе артиллерийской части 11-й механизированной бригады прошла спортивно-патриотическая игра «Зарница» среди учащихся 6–7-х классов школ города и района.

Открытию игры предшествовало прохождение торжественным маршем военнослужащих части. Ну а затем прохождение строем с песней продемонстрировали сами участники. Уровень их строевой подготовки оценили даже присутствующие в жюри офицеры части. Потом школьники соревновались в качестве разведчиков, стрелков, санитаров и связистов. Кульминацией игры стала военно-спортивная эстафета. В конце мероприятия прошла игра на местности и дружеская встреча коллективов художественной самодеятельности.

Победителем «Зарницы» среди 22-х школ стали ребята средней школы №10. Второе место поделили между собой СШ №5 и Жировичская СШ, третье — СШ №8 и Селявичская СШ.

Александр ЗАХАРЕНКО

НАВІНА

ФЛЭШ МОБ КАЛЯ "МЯСТЭЧКА"

Субота, 22 траўня, 17.00. На вуліцы свяціла сонца, а пятнаццаць чалавек з парасонамі на працягу дзвюх хвілін хадзілі каля бара "Мястэчка" са словамі: "Здаецца, дождж пачынаецца".

Не, гэта ніякія не вар'яты. Такім чынам праходзіў першы флэш моб у Слоніме. Што такое флэш моб? Флэш моб — гэта вялікі жарт, сутнасць якога заключаецца ў тым, што ў вызначаны час, у вызначаным месцы, нібы выпадкова, узнікае натоўп. Потым натоўп выконвае загадзя абумоўлены план дзеянняў, пасля чаго адразу знікае.

Падобныя флэш мобы ўжо праходзілі ў Мінску і Гродне, дзе адразу збіралася па некалькі дзесяткаў чалавек. У суботу каля "Мястэчка" на вуліцы Яршова сабралася толькі 15 падлеткаў. Але нічога, галоўнае — пачаць, тым больш што флэшмоберы не засталіся па-за ўвагай: нехта коса паглядзеў на іх, нехта ўсміхнуўся, а некаторыя нават прапаноўвалі прынесці сапраўднай вады. Флэш моб — гэта не рэкламная і не палітычная акцыя, і ўсё гэта робіцца проста так, дзеля забавы. Таму не варта моцна здзіўляцца, калі на вуліцы вы ўбачыце нешта несур'ёзнае, — гэта проста чарговы флэш моб у Слоніме.



Фота аўтара

■ Першы флэш моб у Слоніме правяла моладзь

Антон ТРАФІМОВІЧ

ПРОТЕСТ

МГНОВЕНИЯ «ГОРЯЧЕЙ ВЕСНЫ»

Вы заметили, сколько лет в стране не случалось «горячей весны»? Года четыре. В нынешнем году митинговые бои возобновились. Но не в Минске. Катализаторами неспокойствия стали тихие в недавнем прошлом Гродно и Борисов. Терпение лопнуло у рабочих и предпринимателей.



■ И предприниматели вышли на улицу...

■ Дмитрий ДРИГАЙЛО

Милицейскими дубинками закончился официальный первомайский митинг в Гродно. Там начало начал беспорядков исходит от представителей независимого профсоюза работников крупнейшего предприятия города ОАО «Гродно Азот», который возглавляет депутат местного Совета, член Партии БНФ Сергей Антусевич.

Однако тут же собрались и около двух тысяч предпринимателей с гродненских рынков, которые пришли на площадь с плакатами «Все равны перед законом», «Да здравствует труд», «Лукашенко — в отставку». Столкновения с милицией произошли на первомайской демонстрации в Борисове. Там вместе с активистами незарегистрированного молодежного движения «Зубр» опять-таки «отличились» предприниматели, у которых в этот день началась бессрочная забастовка. В руках у них были черные воздушные шары и плакаты со словами «Страх делает умных дураками», «Лицензия — капкан для предпринимателей!», «Контракт — петля на шее трудящихся!». Заметьте, политические лозунги в среде предпринимателей крайне редки и не первичны. Они требуют отмены лицензирования для розничной торговли и прекращения конфискаций на рынках. Ведь с 1 мая в действие вступил декрет о лицензировании розничной торговли. Однако, например, в Гродно из 6 тысяч человек лицензии оформили только около 20%. Остальные за торговлю без лицензии с 1 мая должны платить штрафы.

А теперь посмотрим, каковы достижения. В Борисове не прошло и недели после первомайских событий, как начались репрессии. На Староборисовском рынке города четверо людей в штатском, представившись сотрудниками Службы безопасности президента, попытались обыскать одного из предпринимателей. При этом они отказались предъявлять документы. Когда предприниматель попытался сопротивляться, его силой затащили в здание администрации рынка и начали избивать. На защиту коллеги стал почти весь рынок. У администрации собралось порядка 150 предпринимателей, которые потребовали, чтобы четверо в штатском предъявили документы и предписание на проверку. В ответ на это люди, представившиеся сотрудниками Службы безопасности президента, вызвали наряд ОМОНа.

В Гродно «сутки» получили лидер стачкома предпринимателей Валерий Левоневский и его сын, в квартирах Левоневского и его заместителя Александра Васильева прошли обыски, организованные КГБ. В Борисове и Гродно задействовали и ОМОН, и оперативников в штатском, и прокуратуру, и ОБЭП, и еще многих представителей большой силовой компании. Что это значит? Скорее всего, что «дело пахнет керосином» и ситуация точно так же может взорваться в любой момент и в любом городе. Ну, не совсем в любом. Заметим, что и в Борисове, и в Гродно есть по две известные независимые газеты. В Борисове это — «Борисовские новости» и «Курьер из Борисова», в Гродно — «Биржа информации» и «День», возглавляемый культовой для Гродно фигурой Николаем Маркевичем. Посему с этой газетой не то что не церемонятся, ее просто "убивают" — тиражи конфискуются, в редакции проводят обыски, журналистам звонят домой и приглашают на разного рода душеспасительные беседы. Но то Маркевич, он, так сказать, «враг со стажем». А предприниматели-то? Не один Шумченко какой-нибудь или Левоневский, а сотни людей, которые обозлены не на шутку. Неслучайно руководство местной вертикали постоянно держит связь с «товарищами из центра», а то не ровен час супостаты пойдут захватывать вокзал и телеграф. Юмор, конечно, черноват, но возникает ощущение, что, если власти не пойдут хотя бы на экономические уступки хотя бы отдельным группам «несознательных граждан», мы все находимся «на пороге грандиозного шухера». ■

ИНТЕРВЬЮ

Владимир ЛЕВОНЕВСКИЙ: «НАСТРОЕНИЕ У МЕНЯ БОЕВОЕ»

■ Андрей ПАЧОБУТ

В субботу, 16 мая, из изолятора временного содержания был освобожден 18-летний Владимир Левоневский, сын лидера Общенационального стачкома предпринимателей Валерия Левоневского. Владимир Левоневский отбывал наказание за организацию первомайской акции протеста. Он согласился ответить на вопросы газеты "День".

— Как настроение после «знакомства» с изолятором?

— Настроение у меня боевое. Я не жалею, что отсидел эти 13 суток. Теперь знаю, что это такое.

— Контактировал ли ты с отцом во время отбывания наказания?

— Нет. Он сидел в «октябрьском» изоляторе, а я в «ленинском». Кроме того, мне были запрещены встречи и меня не выводили на прогулки. Все это время я находился в камере. Только один раз меня вывели на улицу, 13 мая доставили в Административную комиссию, где присудили штраф в размере 95 тысяч за распространение листовок.

— Допрашивали ли тебя сотрудники КГБ?

— Да. Меня допрашивали в качестве свидетеля. Со мной обращались нормально. Сильного давления не было, были «каверзные» вопросы. По-другому было с моей сестрой Екатериной. Она рассказала, что к ней относились по-хамски. Особенно во время обыска. Она делала замечания, а в протокол это не внесли. Ей заявили, что она стороннее лицо, а потом вызвали на допрос в качестве свидетеля. Особенно грубо по отношению к ней вел себя оператор КГБ, который снимал обыск на видеокамеру. Он комментировал все «умными» высказываниями. Видимо, хотел показать, какой он умный.

— Ты знаком со статьей «Конфискация с многоточием...», которая появилась в "Бирже информации"? В частности, там говорится: "последняя акция так называемого Стачкома с его призывами к борьбе в смеси с нецензурными стихами более походит на провокацию, с помощью которой нанесён удар и по независимой газете "День" и по общественным организациям. Не исключено также, что такой "подарок" вышеназванным организациям мог преподнести и кто-нибудь из допрашиваемых..." Как ты это оцениваешь?

— Да, я знаком с этой статьей. Мне было неприятно его читать... Видимо, он был написан по заказу КГБ. Мы сидим, нас прессует КГБ, а тут... Я не знаю, как это возможно в независимой печати, хотя, конечно, "Биржа информации" не такая уж и независимая... ■

ГРАМАДСТВА

АБВІНАВАЧВАЕЦЦА Ў ПУБЛІЧНАЙ ЗНЯВАЗЕ ПРЭЗІДЭНТА

Лідэру незарэгістраванага Рэспубліканскага страйкавага камітэта прадпрымальнікаў, члену каардынацыйнага камітэта Еўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" Валерыю Леванеўскаму працягнуты тэрмін утрымання пад арыштам на 2 месяцы.

Пра гэта БелаПАН са спасылкай на следчага пракуратуры Ленінскага раёна горада Гродна Альфрэда Танкевіча паведаміла жонка прадпрымальніка Марына Леванеўская.

Паводле яе слоў, мужа павінны былі выпусціць з-пад варты. Нагадаем, што 3 мая суд Ленінскага раёна горада Гродна асудзіў Валерыя Леванеўскага на 15 сутак адміністрацыйнага арышту за распаўсюджванне ўлётак з вершамі, у якіх грамадзяне запрашаліся ўзяць удзел у санкцыяваным першамайскім мітынгу. 14 мая тэрмін зняволення ў ізалятары часовага ўтрымання быў працягнуты на трое сутак. Цяпер, як заявілі ў пракуратуры, В. Леванеўскага перавядуць у следчы ізалятар, дзе будзе знаходзіцца падчас правядзення папярэдняга расследавання.

Ён абвінавачваецца паводле часткі 2 артыкула 368 Крымінальнага кодэкса — "публічная знявага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь".

Гэты артыкул прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу ці папраўчых работ на тэрмін да 2 гадоў, або абмежаванне волі на тэрмін да 3 гадоў, або пазбаўленне волі на той жа тэрмін.

Як паведаміла М. Леванеўская, ва ўлётках, якія распаўсюджваў яе муж, былі надрукаваны вершы за подпісам "Чукоўскі".

У гэтых вершах, на думку супрацоўнікаў праваахоўных органаў, і ўтрымліваецца знявага прэзідэнта Беларусі. Аднак, паводле слоў М. Леванеўскай, яе муж вершаў ніколі не пісаў, таму "Чукоўскім" ён быць не можа.

БелаПАН

ВЁСКА

У МАДЗЕЙКАХ ЖЫЎ БАРОН

▪ Сяргей ЧЫГРЫН

Ёсць на Зэльвеншчыне вёска з прыгожаю назваю Мадзейкі. Жывуць у ёй звычайныя людзі, якія, як і ўсе беларусы, вясною, летам і восенню корпаюцца на градах і ў садах, каб на зіму папоўніць свае падвалы садавіной і гароднінай.

Вёска стаіць трохі воддаль ад аўтатрасы Зэльва—Ваўкавыск. Пры ўездзе ў вёску – школа і некалькі двухпавярховых будынкаў, дзе жывуць пераважна настаўнікі. У адным з гэтых дамоў жыве Іван Міхайлавіч Цімафейчык – настаўнік-пенсіянер. Менавіта па яго просьбе мы сюды і завіталі.

Іван Цімафейчык – своеасаблівы і цікавы чалавек. Па-рознаму аб ім адгукаюцца вяскоўцы: адны яго называюць дзіваком, другія пагаджаюцца, што ён адстойвае свае правы, а трэція яго проста не любяць. Але Іван Міхайлавіч не гарыць жаданнем, каб яго любілі. Ён жыве сваім жыццём, сваімі праблемамі і пасвойму іх вырашае.

Іван Цімафейчык паклікаў нас у сваю кватэру і паказаў, як жыве. У яго кватэры – паравое ацяпленне, а на кухні стаіць "буржуйка". А вось у астатніх жыхароў гэтага дома батарэй даўно няма, іх кватэры ацяпляюць толькі печкі. У аднаго спадара Цімафейчыка не адключылі ацяплення, ды ён і не хоча яго пазбаўляцца. Таму што здароўя няма, каб займацца нарыхтоўкаю дроў, ды і печку трэба ў невялікай кватэры скласці. Няхай будзе так, як ёсць, – вырашыў вясковы пенсіянер. Але аднойчы (са слоў Івана Цімафейчыка) на стале кухні перакрылі трубу ад "буржуйкі", маўляў, каб яе не паліў, а яшчэ Іван Міхайлавіч баіцца, каб наогул не адключылі ацяплення. Таму і пішa пенсіянер ва ўсе інстанцыі, патрабуючы справядлівасці, а таксама таго, чаго ён хоча. А такіх жаданняў і праблем у яго назапасілася вельмі шмат. Вось і едуць у Мадзейкі прадстаўнікі розных арганізацый і чыноўнікі, каб разабрацца з тымі крыўдамі і праблемамі, пра якія пастаянна піша і расказвае гэты вясковы Галілей.



▪ Метэарыт "заляцеў" у рукі Івану Цімафейчыку

Мы, журналісты, неяк хацелі пераканаць пенсіянера, каб ён супакоіўся і жыў, як і ўсе яговыя рахманыя землякі. Але дзе там... Іван Міхайлавіч і слухаць не захацеў. Тым больш што ён выйграў некалькі судовых спраў у мясцовых чыноўнікаў, а на іншых – рыхтуе новыя паперы ў суд.

Але, шчыра кажучы, не пра гэта хацелася напісаць, расказваючы пра Івана Цімафейчыка. Ён наогул вельмі здольны і цярплівы чалавек, а таксама арыгінальны суразмоўца. Іван Міхайлавіч шмат гадоў калекцыяніруе кактусы і камяні. Ён пра іх можа расказваць гадзінамі. Вось каб арганізаваць выставу камянёў з калекцыі вясковага збіральніка, напрыклад, у Слонімскім краязнаўчым музеі. Было б што слонімцам паглядзець. Бо розных камянёў у калекцыі Цімафейчыка вельмі многа. Ёсць нават метэарыты і такія камяні, якім па некалькі мільёнаў гадоў. Ды і кактусаў шмат. Іх у кватэры гаспадара можна ўбачыць усюды.

Пасля нашай гутаркі ў двухпакаёўцы Іван Цімафейчык павёў нас знаёміць з яговай вёскай. Нічым яна асаблівым не вылучаецца сярод іншых нашых вёсак. І тут ужо шмат гадоў не працуе лазня, хаця будынак лазні даволі дыхтоўны. За вёскаю вецер гуляе ў былым цялятніку, многія калгасныя пабудовы развальваюцца і расцягваюцца на вачах. Падчас гутаркі з вяскоўцамі высветлілася, што некаторыя з іх нават не ведаюць, да якой гаспадаркі іх вёска сёння адносіцца. Адны кажуць, што да кааператыва імя Леніна, другія – да Мічурына, трэція – да "Прагрэса", а чацвёртым наогул да лямпачкі, куды іх аднеслі ці яшчэ аднясуць: сельскім жыхарам ад гэтага не лягчэй.

Нас моцна ўразіў былы, як тут называюць, панскі хутар. Прыгажэйшага месца на Зэльвеншчыне нам не прыходзілася бачыць. Ён знаходзіцца за вёскамі Мадзейкі і Савічы, побач – Аўдзеевічы, Сухінічы. Недалёка ад хутара нам удалося пагутарыць з пенсіянерам Чэславам Каспярцом, які расказаў пра лёс гэтага хутара і яго гаспадароў. Са слоў мясцовага жыхара, нам стала вядома, што да прыходу бальшавікоў гэты хутар належаў двум панам. "Аднаго з іх прозвішча было барон Вітарф, а другога – Бальскевіч. Пану Бальскевічу ўдалося ўцячы ў Варшаву на ўласным аўтамабілі, а вось барона арыштавалі і расстралялі. Але гэта былі добрыя гаспадары, і вельмі прыгожая ў іх была сяліба. Вы ж бачылі, што ад усяго засталося", – уздыхнуў спадар Каспярэц.

Сапраўды, мы ўбачылі сумны малюнак ад той панскай прыгажосці. Час і людзі знішчылі ўсё. Засталіся толькі падмуркі, сцены некаторых збудаванняў і дубы. Але многія векавыя дрэвы невядомыя асобы спальваюць з карэння, і дубы-волаты падаюць долу і сохнуць. Здаецца, гэта не дубы, а людзі... Іх тут шмат – паваленых, згарэлых і сухіх. А тыя, што растуць, нагадваюць пра залаты час гэтага зэльвенскага куточка. Час не знішчыў толькі бурлівай крынічкі, якая працякае вузкай рачулкай праз увесь былы панскі хутар. Менавіта яна нагадвае пра вечнасць нашага жыцця і папярэджвае пра тое, што чакае нас яшчэ наперадзе. ▪

НАВІНЫ

НАЧАЛЬНІКІ ПАЗБАВІЛІСЯ ПАСАДАЎ

МАСТЫ. На працягу мінулага тыдня два кіраўнікі высокага рангу ў Мастах пазбавіліся сваіх працоўных месцаў.

Гэта – галоўны доктар Мастоўскага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання Міхаіл Собаль, які дваццаць гадоў адпрацаваў на гэтай пасадзе, і дырэктар жыллёва-камунальнай гаспадаркі горада Іван Валюк.

На апошнюю пасаду прызначаны галоўны інжынер гэтай арганізацыі. Хто будзе галоўным доктарам, пакуль невядома, бо гэтае месца было прапанавана некалькім чалавекам з другіх раёнаў вобласці, але яны адмовіліся ўзначаліць Мастоўскае ТМА.

БУЙНЫ ВЫЙГРЫШ

МАСТЫ. Работніца Правамастоўскай амбулаторыі П. была прыемна здзіўлена, калі праверыла білет грашова-рэчавай латарэі "Гарадніца-1".

Па ім яна выйграла аўтамабіль "Жыгулі".

НА МІТЫНГУ ТОЛЬКІ СМЕЦЯЦЬ

МАСТЫ. Так лічаць у Мастоўскім райвыканкаме, і таму з гэтае нагоды адмовілі арганізатарам у правядзенні мітынгу.

У пачатку траўня прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады падалі заяўку на правядзенне ў Мастах мітынгу для абмеркавання працы ва ўмовах кантрактнай сістэмы.

Дакумент быў адрасаваны на імя старшыні райвыканкама Віктара Кудзелі, але яго разглядам занялася намеснік старшыні Таісія Мурына. Не зважаючы на тое, што ў заяўцы арганізатары бралі на сябе адказнасць за захаванне бяспекі падчас правядзення імпрэзы, у адказе значылася, што гэты пункт адсутнічае ў дакуменце.

Але найбольш важкай прычынай адмовы ў правядзенні акцыі стала адсутнасць тлумачэння, хто будзе прыбіраць смецце пасля яе заканчэння, як гэтага патрабуе апошняя версія артыкула 5 Закона аб мітынгах.

КІНУЎСЯ ПАД ЦЯГНІК

МАСТЫ. 37-гадовы мастовец С., раней падсудны, непадалёку ад чыгуначнага вакзала кінуўся пад цягнік.

Прычыны такога ўчынку чалавека невядомыя.

Антон МАКЕЙ

ВЫСТАВА Ў МУЗЕІ

ДЗЯТЛАВА. У Дзятлаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава карцін самабытных мастакоў, якія жывуць і працуюць у раёне.

У прыватнасці, на выстаўцы паказаны цікавыя работы настаўніцы СШ №3 Анжэлы Латушка, Валерыя Грышука, які працуе ў санаторыі "Радон", Аляксандры і Віктара Жыляніных з пасёлка Гезгалы. Да таго ж там змешчаны найлепшыя малюнкі выхаванцаў Дзятлаўскай школы мастацтваў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ДЗЯТЛАВА

МЭБЛЯ З РАТАНГУ

Гэтае памяшканне некалі належала Дзятлаўскаму цэху аб'яднання Гроднамэбля".

З часам з-за нерэнтабельнасці яго расфармавалі і перадалі райбыткамбінату, а той надаўна здаў у арэнду польскаму прадпрыемству "Джианни Романо". Трое гаспадароў наладзілі там вытворчасць мэблі з ратангу. Ратанг – расліна, вельмі падобная да бамбука: лёгкая, моцная, гнуткая. Вельмі дарагая: метр палкі каштуе 6–7 даляраў.

Расце ратанг у Інданезіі. Яго прывозяць ў Польшчу, а з Польшчы – сюды. Плеценая ратангавая мэбля проста цудоўная. Яе можна выкарыстоўваць для дома, для дачы. Выпускаюцца камплекты: адна-, двух- і трохмесныя софы, плюс кафейны столік.

Улічваючы тое, што мэбля дарагая – аднамесная сафа каштуе 360 даляраў, – у Дзятлаве рэдка хто можа дазволіць сабе такую пакупку. Вытворцы актыўна шукаюць рынак збыту за межамі Рэспублікі Беларусь.

Цяпер на прадпрыемстве працуе 16 чалавек.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВОЛКОВЫСК

ПРОКУРОР И СЛЕДОВАТЕЛЬ ОСУЖДЕНЫ ЗА ВЗЯТКУ

Суд Волковысского района на днях вынес приговор прокурору Брестской прокуратуры Саркису Антоняну и старшему следователю МВД Елене Меликсетовой.

В августе прошлого года их задержала оперативная группа КГБ при получении взятки от российского предпринимателя, сообщило ОНТ.

Обвиняемые своей вины не признали, однако суд посчитал совокупность доказательств достаточной для обвинительного приговора. Антоняну и Меликсетовой с учетом амнистии назначено наказание в виде лишения свободы сроком на 6 лет каждому.

Начальник надзорного отдела Республиканской прокуратуры Виктор Корзун сообщил, что российский предприниматель передал Меликсетовой по договоренности 10 тысяч долларов для последующей передачи Антоняну.

Меликсетова передала Антоняну 3 тысячи, а 7 тысяч присвоила, хотя убеждала россиянина в том, что все деньги подлежат передаче Антоняну. Предприниматель рассчитывал с помощью Антоняна поторопить своих должников. Однако сумма, которую потребовала за посреднические услуги Елена Меликсетова, почти в несколько раз превысила сам размер долга. Бизнесмен обратился за помощью в Комитет госбезопасности. В результате Антоняна и Меликсетову задержали с поличным. Дело было передано в Прокуратуру РБ, а суд, во избежание предвзятости, состоялся не в Бресте, а в Волковыске.

Б.П.

Дорогой сыночек и братик

Евгений Юрьевич ЧУХНО!

От всего сердца поздравляем тебя
с днем рождения!



Пусть волшебница-жизнь
На хрустальный поднос
Позолоченный кубок поставит,
В этот кубок здоровья нальет
И на счастье местечко оставит.
Мы целуем тебя, обнимаем,
Бесконечно и нежно любя,
С днем рожденья, родной наш сыночек,
Поздравляем сегодня тебя.
Будь загадочным и желанным,
Самым нежным и долгожданным,
Самым любимым и самым красивым,
Самым-самым на свете счастливым.

С любовью папа, мама, брат

Дорогой и любимый

Николай Филиппович БЕЛУШ!

От всей души поздравляем
тебя с 55-летием!

Желаем тебе:
Чтобы ты не знал ни обид, ни слез,
Чтобы родные и друзья тебя не предавали
И среди жизненной обыденности грез
Тебя везде и всюду узнавали.
От юбилеев в жизни не уйти,
Они настигнут каждого, как птицы,
Но главное – сквозь годы пронести
Тепло души, сердечности частицу.

Твои самые родные люди: жена, дочь, зять и внучка Катенька

Станислава Антоновича ПЛАВСКОГО

тепло и сердечно поздравляем с 50-летием!




Тебе, родной, мы подарили б вечность,
Чтобы длились без конца твои года,
За доброту твою и человечность,
За то, что жалеешь ты всегда.
Тебе мы рады – жена, дети, внуки,
Гордимся, что у нас такой муж, отец и дед!
Пусть небо будет чистым над тобою,
Земной поклон твоим годам!
Желаем счастья, крепкого здоровья
И долгих лет, на радость нам!
Пусть твоя душа никогда не стареет,
А невзгоды и горести обходят тебя стороной!
Спасибо, что ты есть на свете!

С любовью жена, дочь, сын, зять, невестка и внучки Алеся и Кристина

Анатолий Иванович ФЕДОРЧУК,

с днем рождения!



Не подыскать такого слова,
Чтоб в полной мере пожелать
Тебе отличного здоровья
И никогда не унывать.
Желаем счастья и добра,
Поменьше горя и печали,
Чтоб больше было светлых дней,
А хмурые – не посещали.

С любовью жена и сын

Дорогой и уважаемый

Иван Антонович ЛЯНЦЕВИЧ!

Поздравляем тебя с юбилеем!



50 – это много и мало.
Не беда, что видна седина,
Ведь это только начало,
И стучится в сердце весна.
50 – уже взрослые дети –
Гордость твоя, радость семьи.
Твое славное 50-летие
Отмечают с любовью они.
50 – это вовсе не старость,
У тебя уже внуки растут,
50 – огорченье и радость,
Благодарный и искренний труд.

Жена, дочери Наташа и Ирина, зятья Миша и Сергей, внук Лёшка, сваты Лаборы и Батко

Надежда Владимировна ДЕРЕЧИНСКАЯ,

прими наши искренние и сердечные
поздравления с юбилеем!



С юбилеем, дорогая!
Вряд ли женщина другая
Может столь же быть мила.
Мы желаем, чтоб была
Ты счастливой бесконечно,
Молодой осталась вечно,
Пусть твой юбилейный год
Только радость принесет!

С уважением Валентина Алексеевна, Любовь Николаевна, Галина Николаевна

Дорогая и любимая наша мамочка

Наталья Николаевна СЕЛЮК!

От всего сердца, с огромной любовью поздравляем тебя
